# [Дабрачынная навагодняя акцыя «Нашы дзеці» у вымярэнні Мінсувязі]

Навагоднія запаветныя жаданні і Калядныя сны юных выхаванцаў дома-інтэрната № 6 г. Мінска становяцца рэальнасцю. Атмасферу казачнага чарадзейства стварыла традыцыйная навагодняя дабрачынная акцыя «Нашы дзеці».

На працягу 14 гадоў у акцыі актыўна ўдзельнічаюць арганізацыі Міністэрства сувязі і інфарматызацыі і Беларускі прафсаюз работнікаў сувязі, якія аказваюць дому-інтэрнату пасільную дапамогу. Дзякуючы падтрымцы тут уладкоўваецца побыт, набываецца аргтэхніка, папаўняюцца фонды бібліятэкі, абсталявана трэнажорная зала і інш.

14 снежня дзіцячы дом-інтэрнат № 6 наведалі міністр сувязі і інфарматызацыі Сяргей Папкоў, старшыня Рэспубліканскага камітэта Беларускага прафсаюза работнікаў сувязі Ніна Гаўрылава, начальнік РУП «БелДІЭ» Юрый Сямашка.

Выхавальнікі і выхаванцы ўстановы па традыцыі запрасілі ўсіх гасцей наведаць навагодні канцэрт, падрыхтаваны супрацоўнікамі і самімі дзецьмі. Маляўнічыя святочныя выступленні нікога не пакінулі абыякавымі. Здзівілі прафесійна і па-майстэрску выкананыя нумары старэйшых выхаванцаў і кранальныя, шчырыя выступы малодшых школьнікаў.

Напярэдадні самых чароўных і светлых святаў Калядаў і Новага года госці пажадалі дзеткам выканання запаветных жаданняў, дасягнення пастаўленых мэтаў, веры ў поспех і ўласныя сілы. Самыя шчырыя словы падзякі былі накіраваныя ў адрас супрацоўнікаў і выхавальнікаў дзіцячага дома. Бо дзякуючы ім у доме-інтэрнаце дзеці знаходзяць любоў і клопат, становяцца сапраўднай дружнай сям'ёй.

Навагодняя дабрачынная акцыя «Нашы дзеці» - мерапрыемства традыцыйнае. Ад Мінсувязі кожнае дзіця атрымала святочны набор цукерак, Рэспубліканскі камітэт Беларускага прафсаюза работнікаў сувязі набыў для дзіцячага дома навагоднія елкі, якія ўпрыгожылі свята, Рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства «Белтэлекам» забяспечыла магчымасць бясплатнага доступу да інтэрактыўнага тэлебачаньня «ZALA», Рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства «БелДІЭ» закупіла для патрэб ўстановы мэблю і бытавую тэхніку.

У Рэспубліцы Беларусь дзяржава надае вялікую ўвагу ўладкаванню дзяцей-сірот і дзяцей, якія засталіся без апекі бацькоў. Навагодняя акцыя «Нашы дзеці», якая стала ўжо традыцыйнай, дазваляе прыцягнуць увагу да праблем дзяцінства, аказаць дапамогу і падтрымку найменш абароненым катэгорыям дзяцей, якія жывуць у нястачы і якім патрэбны асаблівы клопат і ўвага дзяржавы і грамадства.

Навагодняя дабрачынная акцыя "Нашы дзеці" у Беларусі праходзіць з 9 снежня бягучага года па 8 студзеня 2017 года. Цэнтральнай падзеяй акцыі стане навагодняе свята ў Палацы Рэспублікі. Мерапрыемства запланавана на 23 снежня 2016 года. Яго ўдзельнікамі стануць больш за 2 тыс. дзяцей з усіх рэгіёнаў краіны: вучні-пераможцы алімпіяд, творчых конкурсаў і спартыўных спаборніцтваў, лідары дзіцячых грамадскіх аб'яднанняў і арганізацый, дзеці-

сіроты і дзеці, якія засталіся без апекі бацькоў, дзеці-інваліды, дзеці са шматдзетных і малазабяспечаных сем'яў, сем'яў бежанцаў

**Для даведак:**

***Дзіцячы дом № 6 (установа сацыяльнага тыпу для дзяцей-сірот і дзяцей, якія засталіся без апекі бацькоў) адкрыўся 5 кастрычніка 1998 г. Дзякуючы педагагічнаму калектыву ў дзіцячым доме створана хатняя і ўтульная абстаноўка, дзе дзеці адчуваюць клопат. Зараз у ім пражывае 47 дзяцей ва ўзросце ад шасці да 17 гадоў. З агульнай колькасці дзяцей - 5 біялагічных сірот, астатнія дзеці - сацыяльныя сіроты. За мінулыя 18 гадоў у ім пражывала больш за 500 дзяцей. 120 з іх прыладжаны на выхаванне ў сям'і (апека, усынаўленне, прыёмная сям'я), 45 - удалося вярнуцца ў родныя сем'і. У дзіцячым доме арганізаваны гурткі па інтарэсах: вязанне, вышыўка, тэатральная студыя, фальклорны гурток, мастацкая студыя, дамаводства і інш. Дзеці наведваюць кінатэатры, тэатры, музеі, выставы, дзякуючы спонсарскай дапамозе выязджаюць на экскурсіі.***

---

**Source URL:** *https://mpt.gov.by/news/15-12-2016-1456*